СУСТРЭЧА

# Каб тварыць далей

Наталля САФОНАВА, «ГВ»

**У цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя А. І. Герцэна ўзнагароджвалі пісьменнікаў, якія сёлета вызначыліся на літаратурным Алімпе Гомельшчыны і Беларусі, прымалі ўдзел у творчых конкурсах і праектах, а таксама юбіляраў.**

Спачатку старшыня Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі і вядучы вечарашанавання Уладзімір Гаўрыловіч запрасіў да сцэны Васіля Ткачова, які ў гэтым годзе атрымаў Нацыянальную літаратурную прэмію за зборнік п`ес «Характары».

– Няма патрэбы прадстаўляць Васіля Ткачова як літаратара. Вы – гонар і для зямлі, якая вас нарадзіла, і для творчай арганізацыі, у складзе якой такія выдатныя майстры, – падкрэсліў Уладзімір Мікалаевіч і ўручыў драматургу дыпломы і граматы ад Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Таксама на сустрэчы адбылася прэзентацыя перакладу Вольгі Раўчанка з іспанскай мовы кнігі аўстралійскай пісьменніцы Пас Дамейка «Ігнат Дамейка: з Мядзведкі – у Санцьягадэ-Чылі». Амаль два гады спатрэбілася перакладчыцы на гэтую працу, ёй дапамагала ў няпростай справе рэдактар Эма Прыбыльская. Дарэчы, Ігнат Дамейка – геолаг, географ і этнолаг, знакаміты беларус, які быў рэктарам Чылійскага ўніверсітэта і стаў нацыянальным героем Чылі. Цяпер дзякуючы кнізе мы можам даведацца больш пра свайго знакамітага суайчынніка.



Фота Наталлі САФОНАВАЙ, «ГВ»

А яшчэ на вечары ўшаноўвалі пісьменнікаў-настаўнікаў і маладых літаратараў-вучняў, прэзентавалі кнігі міжнароднага праекта Гомельскага аддзялення СПБ, уручалі міжнародныя ўзнагароды.

Але не толькі з нагоды літаратурных поспехаў сабраліся ў актавай зале бібліятэкі пісьменнікі і іх сябры: тут віталі тых, хто сёлета адзначыў круглую дату. Юбіляры гэтага года – Мікалай Ждановіч, Аляксандр Каляда і Іна Спасібіна.

Шанаванні перамяжоўваліся выступленнямі артыстаў і віншаваннямі ад сяброў для віноўнікаў урачыстасці, а таксама літаратурнымі творамі ў выкананні аўтараў і супрацоўнікаў бібліятэкі.